# БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ТОМ 18

ШЧЫТНІКІ
ЯЯ
ДАДАТАК

КНІГА I

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.П.ПАШКОЎ (галоўны рэдактар), В.С.АНОШКА, Я.М.БАБОСАЎ, В.К.БАНДАРЧЫК, М.А.БАРЫСЕВІЧ, В.І.БОЎШ, Т.Я.БУРАКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А.П.ВАЙТОВІЧ, І.Дз.ВАЛАТОЎСКІ, М.С.ВЫСОЦКІ, І.В.ГАЙШУН, А.М.ГАНЧАРЭНКА, Р.Г.ГАРЭЦКІ, В.М.ГУРЫН, А.М.ДАНІЛАЎ, В.В.ЗУЁНАК, М.П.КАСЦЮК, І.В.КАТЛЯРОЎ, С.Н.КНЯЗЕЎ, П.Д.КУХАРЧЫК, У.Р.ЛАТЫПАЎ, С.С.ЛАЎШУК, І.М.ЛУЧАНОК, Г.М.ЛЫЧ, Л.С.МАЛЬЦАЎ, А.В.МАЦВЕЕЎ, І.Я.НАВУМЕНКА, А.І.ПАДЛУЖНЫ, П.Ц.ПЕТРЫКАЎ, М.Ф.ПІЛІПЕНКА, У.В.РУСАКЕВІЧ, А.В.САБАЛЕЎСКІ, М.А.САВІЦКІ, А.Г.СЛУКА, М.С.СТАШКЕВІЧ, М.В.СТОРАЖАЎ, Л.М.СУШЧЭНЯ, А.К.ФЯДОСАЎ (намеснік галоўнага рэдактара — адказны сакратар), І.П.ХАЎРАТОВІЧ, І.П.ШАМЯКІН, В.П.ШАРАНГОВІЧ.

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
2004

ночак шыракалісты, пярэсна еўрапейская, лілея кучаравая, шпажнік чарапіцавы і інш. У фауне 119 відаў наземных пазваночных жывёл, з якіх у Чырв. кнізе пустальга звычайная, зялёны дзяцел і інш. *П.І.Лабанок.*

**КУРАПА́ЦЕНКА** Валянцін Фёдаравіч (н. 18.12.1933, г. Рэчыца Гомельскай вобл.), расійскі фізік-тэарэтык. Д-р фіз.-матэм. н. (1978), праф. (1983). Засл. дз. нав. Расійскай Федэрацыі (2000). Сын Ф.К.*Курапаценкі.* Скончыў Ленінградскі ун-т (1956). З 1956 у Рас. федэральным ядз. цэнтры — Усерас. НДІ тэхн. фізікі (г. Снежынск Чэлябінскай вобл.). Адначасова з 1992 у Чэлябінскім ун-це, у 1997—99 праф. Снежынскай фіз.-тэхн. акадэміі. Навук. працы па механіцы суцэльных асяроддзяў, матэм. мадэліраванні ў фізіцы і тэхніцы. Прапанаваў метад разліку ўдарных хваль, рознасныя метады рашэння ўраўненняў гідра- і газадынамікі. Распрацаваў фіз. і матэм. мадэлі для разліку ядз. устройстваў, фіз. працэсаў пры ўздзеянні на небяспечныя для Зямлі касм. аб'екты. Прымаў удзел у распрацоўцы ядз. зброі. Дзярж. прэмія СССР 1968.

*Тв.:* Исследование прочности материалов при динамических нагрузках. Новосибирск, 1992 (разам з Б.Л.Глушаком, С.А.Новікавым); Высокоскоростное взаимодействие тел. Новосибирск, 1999 (у сааўт.). *М.М.Касцюковіч.*



Маскоўскай вобл., Расія — 16.9.1990), савецкі ваен. дзеяч. Маршал Сав. Саюза (1983), Герой Сав. Саюза (1981). У Сав. Арміі з 1937. Скончыў Арлоўскае бранятанк. (1939) і Ваенна-паліт. (1941) вучылішчы, Ваен. акадэміі бранятанк. і механізаваных войск (1951) і Генштаба (1958). У Вял. Айч. вайну ў 7-й асобнай арміі, на Варонежскім і 1-м Укр. франтах, з ліст. 1944 камандаваў танк. брыгадай. Пасля вайны — у войсках на камандных пасадах. Са жн. 1966 1-ы нам. галоўнакамандуючага Групай сав. войск у Германіі, з крас. 1968 каманд. войскамі Закаўк. ваен. акругі, з верас. 1971 галоўнакамандуючы Групай сав. войск у Германіі. З ліп. 1972 нам. міністра абароны — нач. Тылу Узбр. сіл СССР. З 1988 у Групе ген. інспектараў Мін-ва абароны СССР.

**КУРМАШО́Ў** Віктар Іванавіч (н. 10.2.1946, Мінск), бел. вучоны ў галіне электроннай тэхнікі, мікраэлектронікі, педагог. Д-р тэхн. н. (1991), праф. (1992). Вынаходнік СССР (1988). Акад. Бел. інж. акадэміі (1999). Скончыў Мінскі радыётэхн. ін-т (1969), дзе і працаваў. З 1992 дырэктар МП «Белсавін». З 1993 дырэктар Рэсп. навук.-метадычнага цэнтра «Алгарытм», з 2002 нам. ды-